УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА"

КАФЕДРА КУЛЬТУРАЛОГІІ

БРЭСЦКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

АДДЗЕЛ ПА ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ, СПОРТУ І ТУРЫЗМЕ

# ЗАБАВЫ І ГУЛЬНІ Ў КУЛЬТУРЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ



Брэст 2007

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА"

КАФЕДРА КУЛЬТУРАЛОГІІ

БРЭСЦКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

АДДЗЕЛ ПА ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ, СПОРТУ І ТУРЫЗМЕ

# ЗАБАВЫ І ГУЛЬНІ Ў КУЛЬТУРЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ

**Рэдактары**
**Ул.П. Люкевіч**
**В. Бужыньскі**
**Т.В. Трафімава**

**Брэст 2007**

УДК 79
ББК 71.1

**Забавы** і гульні ў культуры правядзення вольнага часу дзяцей і падлеткаў: Тэзісы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі / Кафедра культуралогіі Брэсцкага дзярж. ун-та імя А.С. Пушкіна. – Брэст, 2007. – 48 с.

У выданні прадстаўлены тэзісы ўдзельнікаў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Забавы і гульні ў культуры правядзення вольнага часу дзяцей і падлеткаў". У канферэнцыі прымалі ўдзел навукоўцы з Беларусі і Польшчы.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за граматычную правільнасць, падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, лічбаў, цытат, уласных назваў, прозвішчаў, іменаў і іншай інфармацыі.

**УДК 79**
**ББК 71.1**

©Афармленне
Кафедра культуралогіі БрДУ імя А.С. Пушкіна

Псіхолага-педагагічныя даследаванні сведчаць, што дашкольны ўзрост – спрыяльны перыяд для развіцця творчых здольнасцей асобы ў сферы мастацкай дзейнасці, у прыватнасці тэатральна-гульнёвай.

Сёння перад дашкольнымі ўстановамі стаяць наступныя задачы:

- развіццё вобразнага мыслення і ўяўлення;
- актывізацыя дзяцей у пошуку і перадачы сцэнічнага вобраза з дапамогай разнастайных выразных сродкаў;
- разіццё ў дзяцей здольнасцей свядомага кіравання дзеяннямі, уласнымі рухамі і рухамі лялечных персанажаў;
- развіццё выразнасці выканання верша, умення інтанацыйна перадаць тэкст у залежнасці ад зместу, карыстаючыся пры гэтым натуральнымі інтанацыямі і захоўваючы лагічныя паузы, націскі.

УДК 796/799

**ЛЮКЕВІЧ Ул.П.**
Брэст, Беларусь, УА "БрДзУ імя А.С. Пушкіна"

## ДА ПЫТАННЯ АБ ГАЛОЎНЫХ ПАРАДЫГМАХ РАЗВІЦЦЯ СПОРТА

Станаўленне спорту ў сацыякультурнай прасторы XX стагоддзя адбывалася ў першай палове мінулага века і ўвасобілася ў першым алімпійскім дэвізе "Галоўнае не перамога, а ўдзел". Ён стаў кансалідацыйным пачаткам, поўным высакародства, таварыскай прыязні, імкнення да міру і ўзаемапаразумення, быў накіраваны на як мага большае далучэнне шырокіх сацыяльных слаёў да спартыўнай актыўнасці, а таксама на стварэнне нацыянальных, рэгіянальных і міжнародных спартыўных саюзаў і асацыяцый. Сведчаннем гэтага з'яўляецца тое, што менавіта ў дадзены перыяд пачынаецца шырокі алімпійскі рух, а таксама ўтвараецца пераважная большасць арганізацыйных структур самых разнастайных спартыўных федэрацый. На падставе нацыянальных культурных асаблівасцей, перш за ўсё англійскай і нямецкай мадэлей спорту, развівалася і распаўсюджвалася міжнародная форма спорту. Азначаны алімпійскі дэвіз паўстае як першая парадыгма функцыянавання спорту ў культуры XX стагоддзя.

Сёння нават цяжка пераацаніць ролю гэтай парадыгмы ў станаўленні сучаснага спорту. Акцэнтацыя на паняцці "удзелу" зрабіла сваю справу, і ў спартыўныя спаборніцтвы сталі ўключацца прадстаўнікі самых разнастайных сацыяльных слаёў. У той сітуацыі, калі прафесійных спартоўцаў і прафесійнага спорту яшчэ не было, шырокамаштабныя

міжнародныя турніры і Алімпійскія гульні прапагандавалі ідэю роўнапраўнай і сумленнай спартыўнай барацьбы. Распаўсюджванне спорту стала набіраць паскораныя тэмпы на ўсіх кантынентах, што не засталося не заўважаным. Спорт стаў як бы "амартызатарам" нацыянальнай, рэлігійнай і сацыяльна-эканамічнай напружанасці. Гэта, у сваю чаргу, давала большыя шанцы і перспектывы для ўсталявання мірнага супрацоўніцтва.

Глыбокі гуманістычны сэнс, што ўтрымліваецца ў першым алімпійскім дэвізе, стварыў адпаведныя перспектывы для фармавання парадыгмы сучаснага спорту. Спорт заняў месца галоўнага паказальніка наступных працэсаў дэмакратызацыі, лібералізацыі, эмансіпацыі, якія толькі потым сталі праяўляцца ў розных сацыяльных галінах грамадства. Ад гэтага дэвіза яшчэ веяла рамантызмам папярэдняй эпохі, ён яшчэ не быў сапсаваны духам меркантылізма. "Джэнтльмен" ангельскага тыпу дамінаваў пад ягонымі сцягамі, і кожнае парушэнне правілаў успрымалася хутчэй як прыкрая недарэчнасць, чым абуральны спосаб дасягнення перамогі. Сёння гэтая парадыгма выклікае такое ж самотнае пачуццё настальгіі па чыстым таварыскім спаборніцтве, якое часам у адносінах да чыстага паветра нараджаецца ў гарадскога чалавека, які даўным-даўно перасяліўся з вёскі. Але як у першым, так і ў другім выпадку, тая першасная чысціня не вернецца ўжо ніколі.

УДК 908:394

**НЕКРАШЭВІЧ Т.У., БАДЗЕЕВА Н.С.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск, УА "БДПУ ім. М. Танка"

## КРАЯЗНАЎЧАЯ ГУЛЬНЯ ЯК ФОРМА ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

Большасць сучасных школьнікаў мае шмат вольнага часу, які зрэдку запоўнены нечым карысным. Для вырашэння гэтай праблемы сацыяльным педагогам неабходна прапанаваць неардынарныя формы баўлення вольнага часу, бо старыя ўжо не дзейнічаюць. Адной з актыўных і багатых выхавальным патэнцыялам форм з'яўляецца краязнаўчая гульня [1, 56].

Новым і вылучальным у прапанаванай форме з'яўляецца наяўнасць вялікага выхаваўчага і пазнавальнага патэцыялу, эмацыйнасць, рухавасць, калектыўны характар. Краязнаўчая гульня "Горад наш" – інавацыйная форма правядзення вольнага часу, адзін з метадаў грамадскага і духоўнага выхавання, сродак павышэння ўмення ўзаемадзейнічаць. Дадзеная гульня апрабавана членамі гісторыка-краязнаўчага таварыства "Этна". Вопыт ажыццяўлення паказвае, што неабходна выконваць наступныя ўмовы: